**Л.К.Кухто,** *дацэнт*

# ВУЧЭБНЫ ДАПАМОЖНІК ЯК ВАЖНЕЙШЫ КАМПАНЕНТ ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАГА КОМПЛЕКСУ

Аналіз стану сучасных культуралагічных даследаванняў дазваляе канстатаваць, што ў пачатку XXI ст. у Беларусі сфарміравалася абагульненая навука аб культуры, якая надае стройнасць і завершанасць культуразнаўству. Культуралогія як комплексная гуманітарная навука развіваецца на сумежжы гісторыі, філасофіі, сацыялогіі, псіхалогіі, антрапалогіі, этналогіі, мастацтвазнаўства, семіётыкі, лінгвістыкі, інфарматыкі, сінтэзуючы і сістэматызуючы даныя гэтых навук. Сёння культуралогія займае пэўнае месца ў агульнай сістэме ведаў, мае свой прадмет даследавання і канкрэтныя метады. У ёй сфарміраваліся галіны культуралагічных ведаў: гісторыя культуры, гісторыя культурных тэорый, філасофія культуры, сацыялогія культуры, культурная антрапалогія і інш.

Навука аб культуры зараз пераходзіць да новага якаснага этапу: ад разрозненых апісанняў і дэкларацый да сістэматычнага, навуковага пазнання культуры. Тым самым гэта дапамагае чалавеку найлепшым чынам вырашаць складаныя сацыяльна-эканамічныя і духоўныя праблемы, якія ўзніклі на мяжы тысячагоддзяў. Такім чынам, у наяўнасці ўсе перадумовы існавання культуралогіі як самастойнай галіны пазнання. Сёння ў ВНУ нашай краіны ў якасці абавязковага ўведзены вучэбны курс культуралогіі і створаны неабходныя кафедры, што пацвярджае яе самастойнасць і аўтаномію ад іншых дысцыплін.

Таму паўстае пытанне аб вучэбна-метадычным забеспячэнні спецыялістаў у галіне культуры. З гэтай нагоды былі выдадзены вучэбныя дапаможнікі “Культуралогія: тэорыя культуры” [1] і “Культуралогія: гісторыя культуры” [2]. Прапануемыя вучэбныя дапаможнікі паказваюць адзінства разнастайнасці культур, вылучаюць некаторыя агульныя рысы, адметныя асаблівасці культур. Выкарыстанне шэрагу прынцыпаў тыпалагізацыі культур дазваляе паказаць уплыў на культуру пануючых у грамадстве спосабаў вытворчасці, светапогляду, рэлігіі, прыродна-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

геаграфічнага фактару. У дапаможніках аўтары прасочваюць вялікі шлях чалавечай культуры. Культура паўстае як дынамічная сістэма, што ўвесь час змяняецца. Яна развіваецца, набывае адметныя рысы ў прасторы і часе разам з грамадствам, якое яе стварае.

Знаёмства з тыпамі, відамі і формамі культуры паказвае, што культурны свет тысячагоддзяў – багатая разнастайнасць і шматварыянтнасць самабытных культурных адзінак. Яны часам існавалі не сутыкаючыся, маючы сваю прастору і час. Некаторыя з іх існавалі па некалькі тысячагоддзяў, пакінулі глыбокі след і перайшлі нават у пазнейшыя культуры. Аднак у разнастайнасці сацыякультурнага свету можна прасачыць адзіную лінію развіцця чалавецтва, якая вядзе да стварэння агульначалавечай культуры. Кожны народ, кожная цывілізацыя ў пэўны час зрабілі свой уклад. Тэксты дапаможнікаў падмацоўваюцца разнастайным ілюстрацыйным матэрыялам: малюнкамі, выявамі заснавальнікаў айчыннай і замежнай культуралогіі, артэфактаў культуры. Іх матэрыял дазваляе эфектыўна рэалізаваць дыдактычныя тэхналогіі.

Як сведчыць вопыт, укараненне ў культуралагічныя дысцыпліны інфармацыйных тэхналогій дапамагае ўздзейнічаць на памяць і эмоцыі, матывы і інтарэсы студэнтаў, адкрывае доступ да значнай па аб’ёме інфармацыі, дазваляе аблегчыць яе аналітычную апрацоўку. Прапануемыя вучэбныя дапаможнікі з’яўляюцца лагічным працягам навукова-метадычнай працы па стварэнні камп’ютэрнай праграмы па ўсім курсе.

На базе даных дапаможнікаў намі створаны камп’ютэрны комплекс "Культура", які пашырае інтэлектуальную прастору яго карыстальнікаў, з’яўляецца эфектыўным сродкам узбагачэння працэсу пазнання тэорыі культуры. Яго функцыянальнае прызначэнне – прадставіць вучэбную інфармацыю і садзейнічаць арганізацыі навучання з улікам індывідуальных магчымасцей і пажаданняў карыстальнікаў. Педагагічны праграмны сродак (ППС) дазваляе арганізаваць і падтрымліваць вучэбны дыялог студэнта з камп’ютэрам. ППС з’яўляецца інтэрактыўнай камп’ютэрнай распрацоўкай, у склад якой уваходзяць музычнае суправаджэнне, відэакліпы, анімацыя, галерэі карцін і слайдаў, розныя базы даных і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Такім чынам, пры выкарыстанні вучэбных дапаможнікаў студэнты змогуць авалодаць асноўнымі культуралагічнымі паняццямі, тэрмінамі, пазнаёміцца з замежнымі і айчыннымі даследчыкамі культурнай дзейнасці, метадамі і формамі далучэння чалавека да свету культуры. У сваю чаргу, гэта дазволіць ім выявіць функцыі культуры, вызначыць ролю культуры ў жыцці чалавека, асаблівасці сучасных культурных працэсаў на тэрыторыі Беларусі і ў замежных краінах.

---


1. *Смолік, А.І.* Культуралогія: тэорыя культуры: вучэб. дапам. / А.І.Смолік, Л.К.Кухто. – Мн.: Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2008. – 281 с.

2. *Смолік, А.І.* Культуралогія: гісторыя культуры: вучэб. дапам. / А.І.Смолік, Л.К.Кухто, А.А.Цобкала. – Мн.: Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2009. – 311 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ